# СЁННЯ — МІЖНАРОДНЫ ЖАНОЧЫ ДЗЕНЬ

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 8 (638) | Субота, 8 сакавіка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап



На кожным факультэце, у кожнай студэнцкай групе з цікавасцю знаёмяцца студэнты з матэрыяламі XXVII з'езда КПСС.

На здымку: будучыя біёлагі Ірына Палевікова, Галіна Касьян, Алена Маладзякова і Наталля Лазоўская абмяркоўваюць Палітычны даклад ЦК КПСС XXVII з'езду партыі, з якім выступіў М. С. Гарбачоў.

Фота Н. КІР'ЯНАВАЙ.

*ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ*

# НА XXVII З'ЕЗДЕ КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

3 сакавіка 1986 года XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза працягваў работу.

На ранішнім пасяджэнні з дакладам «Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года» выступіў Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш Рыжкоў Мікалай Іванавіч. Даклад быў выслухан з вялікай увагай і неаднаразова суправаджаўся апладысментамі.

Затым пачалося абмеркаванне даклада.

На вячэрнім пасяджэнні працягвалася абмеркаванне даклада «Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года».

З'езд утварыў камісію для разгляду паправак і дапаўненняў да праекта Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года і падрыхтоўкі праекта пастановы па гэтаму пытанню.

4 сакавіка 1986 года XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза на ранішнім і вячэрнім пасяджэннях працягваў абмеркаванне даклада «Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года».

На вячэрнім пасяджэнні пад авеянымі славай баявымі сцягамі ў залу уваходзіць дэлегацыя Узброеных Сіл СССР. Удзельнікі з'езда стоячы працяглымі апладысментамі сустракаюць савецкіх воінаў.

Ад імя асабовага саставу Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту з прывітаннем да з'езда звярнуўся камандзір танкавай дывізіі генерал-маёр В. С. Міхайлаў.

Ён запэўніў Камуністычную партыю, увесь савецкі народ, што воіны Узброеных Сіл надзейна ахоўваюць свяшчэнныя рубяжы нашай Радзімы. Разам з брацкімі арміямі краін сацыялістычнай садружнасці, верныя інтэрнацыянальнаму абавязку, яны заўсёды гатовы абараніць вялікія заваёвы сацыялізму, даць сакрушальны адпор любому агрэсару.

5 сакавіка 1986 года XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза працягваў работу.

На ранішнім пасяджэнні працягвалася абмеркаванне даклада «Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 19866—1990 гады і перыяд да 2000 года».

Затым ад камісіі, утворанай з'ездам для падрыхтоўкі праекта пастановы па абмеркаванаму пытанню, выступіў таварыш Зайкоў Л. М.

З'езд аднагалосна зацвярджае Асноўныя напрамкі эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перыяд да 2000 года з унесенымі дапаўненнямі і змяненнямі і прымае пастанову па данаму пытанню.

Прымаецца да ведама паведамленне Сакратарыята з'езда аб праведзенай ім рабоце па разгляду пісем, зваротаў, прапаноў, заўваг і апеляцый, адрасаваных XXVII з'езду КПСС. З'езд даручыў Цэнтральнаму Камітэту КПСС завяршыць гэту работу і прыняў адпаведную пастанову.

Затым з'езд пачаў разгляд наступнага пункта парадку дня — выбары цэнтральных органаў партыі.

* * *

6 сакавіка 1986 года на ранішнім пасяджэнні XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза старшыня падліковай камісіі таварыш Саломенцаў М. С. абвясціў вынікі выбараў цэнтральных органаў партыі.

У час перапынку ў рабоце з'езда адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

На прадоўжаным пасяджэнні з'езд заслухаў паведамленне аб выніках работы Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС і пасяджэнні Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС, выбраных XXVII з'ездам партыі.

Генеральным сакратаром ЦК КПСС аднадушна выбран таварыш Гарбачоў Міхаіл Сяргеевіч.

Пленум выбраў Палітбюро ЦК КПСС, Сакратарыят ЦК КПСС, зацвердзіў старшыню Камітэта Партыйнага Кантролю пры ЦК КПСС.

Цэнтральная Рэвізійная Камісія КПСС на сваім пасяджэнні выбрала старшыню камісіі.

У канцы пасяджэння Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Гарбачоў М. С. выступіў з заключнай прамовай, якая была выслухана з вялікай увагай і неаднаразова перапынялася працяглымі апладысментамі.

М. С. Гарбачоў аб'яўляе XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза закрытым.

Удзельнікі з'езда з натхненнем выконваюць партыйны гімн «Інтэрнацыянал».

## аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта КПСС

6 сакавіка 1986 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС, выбранага XXVII з'ездам Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Пленум аднагалосна выбраў таварыша Гарбачова М. С. Генеральным сакратаром ЦК КПСС.

Пленум выбраў Палітбюро ЦК КПСС у наступным саставе:

Члены Палітбюро таварышы Гарбачоў М. С., Аліеў Г. А., Варатнікоў В. І., Грамыка А. А., Зайкоў Л. М., Кунаеў Д. А., Лігачоў Я. К., Рыжкоў М. І., Саломенцаў М. С., Чэбрыкаў В. М., Шчарбіцкі У. В., Шэварднадзе Э. А.

Кандыдаты ў члены Палітбюро таварышы Далгіх У. І., Дземічаў П. Н., Ельцын Б. М., Сакалоў С. Л., Салаўёў Ю. П., Слюнькоў М. М., Талызін М. У.

Сакратарамі ЦК КПСС выбраны таварышы Гарбачоў М. С. — Генеральны сакратар, Бірукова А. П., Дабрынін А. Ф., Далгіх У. І., Зайкоў Л. М., Зімянін М. В., Лігачоў Я. К., Мядзведзеў В. А., Нікановў В. П., Разумоўскі Г. П., Якаўлеў А. М.

Пленум зацвердзіў старшынёй Камітэта Партыйнага Кантролю пры ЦК КПСС таварыша Саломенцава М. С.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ аб пасяджэнні Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС

6 сакавіка 1986 года адбылося пасяджэнне Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС.

Камісія выбрала старшынёй Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС таварыша Капітонава І. В.

Камісія выбрала бюро Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі КПСС у саставе таварышаў: Капітонаў І. В. — старшыня, Нізоўцава А. А. — намеснік старшыні, Коннаў В. Ф., Лапцеў П. П., Халдзееў М. І. — члены бюро ЦРК КПСС.

## ПА МАТЭРЫЯЛАХ З'ЕЗДА

Абмеркаванне Палітычнага даклада ЦК КПСС XXVII з'езду партыі, з якім выступіў М. С. Гарбачоў, адбылося ў ленінскім пакоі інтэрната № 1, куды прыйшлі загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі Р. Р. Лазько, яе выкладчыкі А. М. Бабкоў, І. П. Бязручка, А. А. Цітова і жыхары інтэрнатаў № 1 і № 3. Перад студэнтамі выступіў дацэнт Р. Р. Лазько. Ён сканцэнтраваў увагу на ключавых праблемах унутранага развіцця краіны, пастаўленых на XXVII з'ездзе, падкрэсліў палітычны аптымізм і творчы дух даклада.

На сустрэчы закраналіся і іншыя пытанні, якія больш за ўсё цікавілі студэнтаў.

У хуткім часе адбудзецца новая гутарка выкладчыкаў з жыхарамі інтэрнатаў. Будуць дадзены вычарпальныя адказы на ўсе пытанні, якія датычаць жыцця нашай краіны, яе міжнароднай палітыкі.

Жана ВЛАСЕВІЧ,
студэнтка гр. Г-22 гісторыка-філалагічнага факультэта.

## ВІНШУЕМ!

За плённую працу па падрыхтоўцы і камуністычнаму выхаванню моладзі, шматгадовую актыўную прапагандысцкую дзейнасць і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры гісторыі КПСС нашага універсітэта МАТУСЕВІЧ Віталь Уладзіміравіч узнагароджаны Ганаровай граматай абкома КПБ і абласнога Савета народных дэпутатаў.

* * *

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта горача віншуюць в. а. загадчыка кафедры фізічнай метралогіі АЛЯШКЕВІЧА Мікалая Іванавіча і асістэнта кафедры оптыкі ШОЛАХ Валянціну Рыгораўну з выпадку зацвярджэння іх ВАКам у вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

## ІНТЭРВ'Ю ПАСЛЯ ТВОРЧАЙ СУСТРЭЧЫ

# Уладзімір КОНКІН: «...ВЫЙГРАВАЦЬ З САБОЮ КОЖНЫ БОЙ»



**Госцем кнігалюбаў, слухачоў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ быў нядаўна артыст кіно Уладзімір Конкін.**

ПА УЗРОСТУ ён яшчэ малады акцёр — яму 34 гады. А ў кіно ім сыграны ўжо 24 ролі. І першая з іх — Паўкі Карчагіна, асобы надзвычай валявой, моцнай духам, — самая дарагая для яго, самая памятная і для нас, гледачоў, бо менавіта яна прынесла нам радасць адкрыцця і знаёмства з таленавітым артыстам. За выдатнае выкананне ролі П. Карчагіна ў тэлевізійным фільме рэжысёра М. Машчанкі Уладзімір Конкін быў удастоены прэміі Ленінскага камсамола.

І вось артыст перад намі. Зусім не экранны, не сцэнічны.

**— Уладзімір Аляксеевіч! З таго часу, як адбыўся Ваш удалы дэбют у кіно, прайшло звыш 10 гадоў. Безумоўна, запрашэнняў ад многіх рэжысёраў здымацца ў Вас было больш чым дастаткова. Па якому прынцыпу Вы выбіралі для сябе ролю, якую б хацелі сыграць?**

— Так, недахопу ў запрашэннях не было. Але часта даводзілася ад іх адмаўляцца. Па-першае - таму, што прытрымліваюся прынцыпу: «Лепш менш, ды лепш», па-другое, каб не паўтарацца. Мне прапаноўвалі ролі абавязкова гераічнага плана, а хацелася на самым пачатку свайго творчага шляху не выпрацоўваць нейкі стэрэатып. Жыццё ж вельмі шматграннае, і акцёру неабходна «паварочвацца» да гледача ўсімі бакамі майстэрства, заўсёды шукаць нешта новае, спрабаваць сябе...

**— Вашы найбольш удалыя, скажам так, этапныя работы ў кіно звязаны з іменамі многіх вядомых савецкіх рэжысёраў. У каго б Вам хацелася яшчэ сыграць, чыё запрашэнне на здымкі Вы сустрэлі б з асаблівай радасцю?**

— Моцнага жадання зняцца ў якога-небудзь прэстыжнага рэжысёра ў мяне няма. Лічу, што не гэта галоўнае для акцёра, бо працуючы з такім майстрам кіно артысту даводзіцца падпарадкоўвацца яго волі, яго разуменню вобраза. А акцёр жа —чалавек таксама творчы. Іншы раз яму даводзіцца адчуваць нібы ўнутранае супраціўленне многаму з таго, што рэжысёр прапаноўвае рабіць. Мне падабаецца працаваць з такімі рэжысёрамі, якія выслухаюць і мае прапановы адносна ролі. Можа не адразу, але ўсё ж згодзяцца нешта перагледзець у ёй, пераасэнсаваць, калі хочаце. Такая садружнасць і ўзаемаразуменне двух аднадумцаў, творцаў вобраза ідзе толькі на карысць. Так, напрыклад, здарылася ў нас з рэжысёрам у час работы над фільмам «Цётка Маруся». Здымкі яго вядуцца цяпер на кінастудыі «Беларусьфільм».

**— Вы шмат ездзіце па краіне, сустракаецеся з гледачамі на творчых сустрэчах, вас слухаюць людзі самых розных узростаў. А калі Вы бачыце ў зале моладзь, што перш за ўсё Вам хочацца сказаць ёй?**

— Вельмі люблю маладзёжную аўдыторыю, імкнуся да таго, каб у нас атрымаўся ўнутраны дыялог. Канешне, гэта не значыць, што належнага кантакту не знаходжу з людзьмі больш сталымі. Мы жывем у складаным, напружаным свеце. Ідзе вострая ідэалагічная барацьба двух светапоглядаў. Кіно — гэта таксама сродак гэтай барацьбы за розумы людзей, таму з прадстаўнікамі нашага маладога пакалення трэба весці гутарку аб савецкіх ідэалах, пацвярджаць іх яскравымі прыкладамі з айчыннага кінамастацтва. Гавару з моладдзю пра тое, якія ў гэтым плане надзвычай адказныя задачы стаяць перад акцёрамі, якая гэта прафесія нялёгкая...

**— Прозвішча Конкін мы сустракаем не толькі ў цітрах фільмаў, але і на старонках цэнтральных газет, у прыватнасці, «Советская культура», і што прыемна, нават нашай беларускай — «Чырвонай змены». Даводзілася чытаць Вашы праблемныя артыкулы аб кінамастацтве, апавяданні... Значыць, ваша хобі журналістыка?**

— Гэта гучна сказана. Проста люблю пісаць. Калі лічу неабходным выказаць тыя ці іншыя меркаванні, думкі аб праблемах сённяшняга кінамастацтва, або бывае лірычны настрой і выпадае вольны час (што бывае рэдка) бяруся за пяро. Яшчэ ў школьныя гады маёй «стыхіяй» былі сачыненні па літаратуры, матэматыку ж, іншыя дакладныя навукі не любіў. І што казаць, быў грэх, часта пісаў сачыненні многім сваім аднакласнікам у абмен на рошаныя задачкі.

**— У нашым сучасным жыцці ёсць яшчэ нямала праблем, у вырашэнні якіх мог бы ўдзельнічаць і кінематограф. Яны ж пакуль што застаюцца «па-за яго кадрам». Як, на Вашу думку, павінны ўздымацца надзенныя праблемы у нашым кінамастацтве?**

—Так, час прыйшоў гаварыць прынцыпова і рашуча аб тым, што не заўсёды наша кіно трымала руку на пульсе часу. Гэта адзначалася і ў Палітычным дакладзе Цэнтральнага Камітэта КПСС XXVII з'езду Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. «Справядлівыя нараканні,— гаворыцца ў ім,—выклікае нізкі ўзровень некаторых літаратурных твораў, тэлепраграм, кінафільмаў, у якіх адсутнічае не толькі ідэйная і эстэтычная яснасць, але і элементарны густ». Вырашыць грандыёзныя планы сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, якія намечаны на XXVII з'ездзе КПСС, немагчыма без павышэння ступені сталасці грамадства, без узбагачэння духоўнага свету чалавека. Задача кінамастацтва, як і літаратуры,— сярод многіх важных якасцей выхоўваць у чалавеку імкненне да самаўдасканальвання.

Кожны сапраўдны акцёр абавязаны мець абвострaную грамадзянскую пазіцыю. Вельмі добра пра гэта сказаў маскоўскі паэт Д. Касцюрын. І мне гэтыя радкі таксама блізкія.

**«...И вновь я понял, что**
**себе дороже,**
**Выигрывать с собою**
**каждый бой».**

**— Наша сустрэча адбываецца напярэдадні Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка. У нашым універсітэце вучыцца пераважная большасць дзяўчат, працуе шмат жанчын. Што б Вы хацелі ім пажадаць?**

— Лепш зраблю гэта пісьмова.




**Гутарку вяла карэспандэнт газеты Т. ДУБЯК.**

**Фота Н. КІР'ЯНАВАЙ.**

*Вашы захапленні*

# АДДАНАСЦЬ МУЗЫЦЫ

Любяць у дружнай сям'і Касаевых збірацца разам па вечарах пасля ўсіх дамашніх клопатаў, каб паспяваць, паслухаць музыку. У яе кватэры выбар музычных інструментаў, як кажуць, на ўсе густы. Для Святланы, студэнткі, — фартэпіяна. Яе брат, дзесяцікласнік Сяргей, ніколі далёка не кладзе акардэон. Ён у яго пад рукамі заўсёды. На гармоніку іграе іх дзядуля Арсенцій Карпавіч. Праўда, гады яго ўжо не тыя, што раней, калі ў вёсцы, дзе жыў да выхаду на пенсію, ніводнае вяселле без яго музыкі не абыходзілася. Калі ў Касаевых якая-небудзь сямейная ўрачыстасць, свята, бярэ ён гармонік у рукі, расцягне яго мяхі, тады ж маладосць сваю ўспомніць і яго жонка Лукер'я Аляксееўна, завядзе ўсё яшчэ звонкім голасам задушэўную песню. Яе падтрымае дачка Люба. На фабрыцы «Палесдрук», дзе Любоў Арсенцьеўна працуе майстрам, яе ведаюць як актыўную ўдзельніцу хору. Свая роля ў гэтым сямейным ансамблі адведзена і Анатолю Гаўрылавічу — ён таксама спявае, можа іграць і на балалайцы. Сам некалі асвоіў гэты няхітры інструмент. Шкада толькі, што ў доме няма яго цяпер. Музычныя, закальныя здольнасці старэйшых і малодшых Касаевых дапоўніць і Уладзімір Арсенцьевіч Касаеў, цяпер маёр у адстаўцы, калі прыязджае ў Гомель да сваякоў на адпачынак ці на святы. Ён можа іграць на баяне.



Не дзіўна, што Святлана, другакурсніца матфака ГДУ, якая вырасла ў такой цікавай сям'і, дзе любяць мастацтва, усёй сваёй душой і сэрцам палюбіла музыку.

Яна закончыла музычную школу па класу фартэпіяна. І цяпер дзяўчыну ведаюць на факультэце, ва універсітэце як актыўную ўдзельніцу мастацкай самадзейнасці, аўтара і выканаўцу сваіх песень. Пісаць іх яна пачала яшчэ ў восьмым класе. Так, для сябе, для душы, як яна гаворыць. Нікому іх не адважвалася паказваць. Але калі спатрэбілася прадставіць на раённы конкурс палітычнай песні нумары ад СШ № 14, дзе яна вучылася, усё ж набралася смеласці паказаць сваю «Песню аб Чылі» піянерважатай. Так адбыўся дэбют Святланы. Потым яна была неаднаразовай удзельніцай гарадскіх і абласных конкурсаў песні. Спявала ўжо не адна, а з сяброўкамі Наташай Драбышэўскай і Наташай Каралько. Яны, звычайна, пісалі вершы, яна ж перакладала іх на музыку, у час канцэртаў акампаніравала на фартэпіяна. «Мір планеце», «Задумайцеся» — назвы напісаных імі песень гавораць аб тым, што хвалявала дзяўчат, аб чым хацелі сказаць усім.

Цяпер Святлана Касаева выступае са сваёй аднакурсніцай Ларысай Міхаленка (яны сааўтары песень) амаль на ўсіх універсітэцкіх конкурсах, на вечарах. Кожная новая створаная імі песня цёпла ўспрымаецца слухачамі. І не толькі на універсітэцкай сцэне. Так было і ў час Зорнага паходу, у якім прымалі ўдзел Святлана і Ларыса.

Калі чалавек творчы, ён заўсёды ў пошуку. Святлана Касаева належыць да такіх людзей. У яе нямала цікавых задум. Няхай яны здзейсняцца!

**Т. НІКАЛАЕВА.**

**На здымку: Святлана Касаева.**

**Фота Н. Кір'янавай.**

# ЗАСЛУЖЫЛІ ПАДЗЯКІ

**Абласны савет народных універсітэтаў культуры аб'явіў падзякі групе найбольш актыўных кіраўнікоў факультэтаў, удзельнікаў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання ГДУ. Сярод іх—рэктар народнага універсітэта дацэнт Т. П. Гараніна, яго прарэктар дацэнт І. В. Хадалевіч, дэкан факультэта педагагічнай этыкі дацэнт кафедры хіміі В. Р. Свірыдзенка, дэкан факультэта этыкі і эстэтыкі асістэнт кафедры матаналізу Г. І. Міцкевіч, намеснік дэкана гэтага факультэта бібліятэкар Я. У. Аксюцік, кіраўнік літаратурнага клуба «Градыент» загадчыца сектара ідэйна-масавай работы бібліятэкі ГДУ Н. П. Капшай, выкладчыцы факультэта выяўленчага мастацтва Л. С. Кавалеўская і Л. В. Панова.**

**«Ваша грамадская дзейнасць, — запісана ў падзяках, — з'яўляецца прыкладам сацыяльнай актыўнасці савецкага чалавека і служыць высакароднай справе эстэтычнага выхавання працоўных».**

# ПРЫСВЕЧАНЫ СВЯТУ ЖАНЧЫН

У мінулую сераду ў актавай зале універсітэта адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны Міжнароднаму жаночаму дню — 8 Сакавіка. Уступным словам яго адкрыў сакратар парткома М. І. Старавойтаў.

З дакладам на вечары выступіў загадчык кафедры беларускай літаратуры кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер.

Начальнік аддзела кадраў П. А. Савінскі зачытаў загад па універсітэту, у якім рэктар акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць павіншаваў усіх жанчын ГДУ са святам, а лепшым выкладчыцам, супрацоўніцам і студэнткам за поспехі ў працы, вучобе і грамадскай дзейнасці аб'явіў падзяку.

Удзельнікі мастацкай самадзейнасці ГДУ выступілі на вечары са святочным канцэртам.

**Павел КУДРЯВЦЕВ.**

## ВОСЬМОЕ МАРТА

**Все**
**В этот день**
**Торжественно**
**И свято.**
**В руках — мимозы,**
**В сборе вся семья.**
**И кажется,**
**Стоят**
**Немного виновато**
**Перед тобой**
**И муж**
**И сыновья...**
**И у меня**
**Одно,**
**Одно в душе желанье:**
**Чтоб этот день —**
**Больших мужских забот —**
**Не оставался**
**Как воспоминанье,**
**И длился долго-долго,**
**Круглый год!.**

*НАШЫ ЮБІЛЯРЫ*

# БАЕЦ ІДЭАЛАГІЧНАГА ФРОНТУ

**У** ДНІ работы XXVII з'езда партыі загадчыку кафедры гісторыі КПСС Віталю Уладзіміравічу Матусевічу споўнілася 50 гадоў. Вучоны-грамадазнаўца з пачуццём высокай адказнасці цяпер можа азірнуцца на пражытыя гады і вызначыць баявы настрой на будучыню.

У 1959 годзе па заканчэнні Гомельскага пединстытута імя В. П. Чкалава В. У. Матусевіч працаваў настаўнікам, а са студзеня 1963 года — прапагандыстам аддзела прапаганды і агітацыі Чыгуначнага РК КПБ г. Гомеля. Са жніўня 1964 года ён пераходзіць на выкладчыцкую работу. У Гомельскім пединстытуце, затым ва універсітэце прайшоў усе ступенькі творчага і навуковага росту і грамадскага сталення.

Большую частку свайго жыцця Віталь Уладзіміравіч аддаў любімай справе — гісторыі. Пастаянны навуковы пошук прывёў яго ў аспірантуру Белдзяржуніверсітэта, якую ён закончыў у 1970 годзе і ў хуткім часе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю.

Веды, вопыт работы ў партыйных органах дапамаглі маладому вучонаму стаць добрым педагогам. Цяпер Віталь Уладзіміравіч дапамагае маладым выкладчыкам авалодваць педагагічным майстэрствам. Ён прымае актыўны ўдзел у навукова-даследчай рабоце кафедры, з'яўляецца кіраўніком дзяржбюджэтных тэм, аўтарам і адным з рэдактараў «Нарысаў гісторыі Гомельскай абласной арганізацыі КПБ», арганізатарам навуковай работы студэнтаў.

Камуніст В. У. Матусевіч лічыць сваім абавязкам прымаць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці універсітэта і горада, выконвае даручэнні абласнога, гарадскога і раённага камітэтаў партыі, партарганізацыі універсітэта, аказвае дапамогу прапагандыстам вобласці, вядзе арганізацыйную і лекцыйную работу ў таварыстве «Веды». Ён з'яўляецца лектарам гаркома КПБ, старшынёй метадычнага Савета кабінета палітасветы Цэнтральнага райкома КПБ, намеснікам сакратара партбюро эканамічнага факультэта. В. У. Матусевіч сістэматычна выступае з дакладамі і лекцыямі перад партыйным актывам, працоўнымі Гомеля і вобласці. За актыўную работу па прапагандзе марксісцка-ленінскай тэорыі і камуністычнаму выхаванню працоўных ён узнагароджаны Ганаровымі граматамі ЦК ВЛКСМ, Цэнтральнага РК КПБ і райсавета народных дэпутатаў.



Віншуючы Віталя Уладзіміравіча Матусевіча з 50-гадовым юбілеем, калектыў кафедры гісторыі КПСС жадае яму моцнага здароўя, шчасця, вялікіх творчых поспехаў у справе падрыхтоўкі маладых спецыялістаў і камуністычнага выхавання моладзі.

**У. КСЯНЗОЎ,**
**партгрупорг кафедры гісторыі КПСС.**
**Т. ЯЗЭПАВА,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС, член партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта.**

Фота Н. Кір'янавай.

# ВЫСТУПІЛА ДЭПУТАТ

На мінулым тыдні ў пятніцу ў інтэрнаце № 2 адбылася сустрэча дэпутата Чыгуначнага раённага Савета народных дэпутатаў Л. П. Шапіра са студэнтамі матэматычнага факультэта. Яна расказала аб рабоце Савета народных дэпутатаў за час, які прайшоў пасля выбараў, адказала на пытанні прысутных. Студэнты далі свайму дэпутату наказы, выказалі ўдзячнасць за цікавую і карысную сустрэчу.

**А. КАМОРНІКАЎ,**
**куратар інтэрната № 2.**

**СПОРТ**

# ДВА ТУРЫ — БЕЗ ПАРАЖЭННЯЎ

У г. Бабруйску праведзены гульні другога тура чэмпіянату БССР па ручному мячу сярод жанчын. Як і на пачатковым этапе спаборніцтваў у Гродна, паспяхова выступіла каманда Гомельшчыны, укамплектаваная ў асноўным студэнткамі ГДУ (трэнер В. Крукоўскі). Спачатку ў сваёй падгрупе яна нанесла паражэнні спартсменкам Брэста і Віцебска адпаведна з лікам 37:20 і 27:20, а ў фінале — мінчанкам —22:11 і магіляўчанкам — 24:10.

По выніках двух тураў права працягваць барацьбу за медалі чэмпіянату заваявалі каманды Гомеля, Мінска, Магілёва і Брэста. На заключным этапе спаборніцтваў да іх далучыцца каманда Беларускага політэхнічнага інстытута, якая выступае ў другім эшалоне савецкіх гандбалістак і ў чэмпіянаце СССР з'яўляецца адной з асноўных прэтэндэнтак на выхад у вышэйшую лігу айчыннага гандбола. З яе ўдзелам і пойдзе барацьба за месца на п'едэстале гонару першынства рэспублікі.

**Б. ВАЛОДЗІН.**

# КІНО Ў ДАПАМОГУ ВЫКЛАДЧЫКУ

У фільматэку Гомельскага кінапракату паступілі новыя навукова-папулярныя кінафільмы:

**Інжынеры мікрасвету.** 1 ч. (Пра маладога кіеўскага вучонага-генетыка Ю. Ю. Глеба і яго калег).

**Масцанараджэнне ў шклянцы.** 1 ч. (Гісторыя ўзнікнення ізумрудаў і іншых каменняў).

**Масква-Парыж: канструктыўны дыялог.** 5 ч. (Візіт М. С. Гарбачова ў Францыю).

**Побач з мірным атамам.** 1 ч. (Аб выкарыстанні вадароду ў прамысловасці і на транспарце).

**Эцюд аб утаймаваным промні.** 2 ч. (Аб новым вынаходніцтве — лазерным генератары).

Заказ фільмаў праводзіцца за 10 дзён да дэманстрацыі. Звяртацца ў лабараторыю тэхнічных сродкаў навучання (1-ы вучэбны корпус, аўд. 1—10, 3—7).

# ПРАПАНУЕМ АФОРМІЦЬ ПАДПІСКУ

У кнігарні «Падпісныя выданні» (вул. Савецкая, 3) працягваецца падпіска на сачыненні Г. В. Лейбніца ў 4-х тамах (выйшлі 1, 2, 3 тт.). Выпуск ажыццяўляе выдавецтва «Мысль».

Г. В. Лейбніц — буйнейшы нямецкі энцыклапедыст, філосаф-ідэаліст, вучоны і грамадскі дзеяч. З яго імем звязана нараджэнне вышэйшай матэматыкі, матэматычнай логікі, механікі, фізікі, біялогіі.

Філасофія Лейбніца — класічная сістэма аб'ектыўнага ідэалізму — утрымлівала глыбокія ідэалістычныя ідэі. Лейбніц лічыцца заснавальнікам дыялектыкі Новага часу, які адкрыў адну з самых велічных старонак у гісторыі думкі — эпоху нямецкай класічнай філасофіі канца XVII пачатку XIX ст.

У чатырохтомнік філасофскіх сачыненняў Лейбніца ўключаюцца асноўныя яго працы (у тым ліку шмат пісьмаў) па філасофіі, навуковай метадалогіі, логіцы.

Выданне выходзіць у серыі «Философское наследие» і разлічана на навуковых супрацоўнікаў, выкладчыкаў і студэнтаў ВНУ, на ўсіх тых, хто цікавіцца гісторыяй.

**Н. ХАРОШКА,**
**загадчыца магазіна.**

# УПОРАВЕНЬ З ЧАСАМ

**У нашай рэспубліцы шырока адзначаецца 90-гадовы юбілей старэйшыны беларускай літаратуры, народнага пісьменніка БССР Кандрата Крапівы. Яго багатыя творчыя набыткі па-ранейшаму захапляюць і хвалююць чытачоў, не страчваюць сваёй актуальнасці і злабадзённасці.**

5 сакавіка — у дзень нараджэння таленавітага байкапісца і драматурга ў ГДУ адбылася канферэнцыя чытачоў на тэму: «Кандрат Крапіва і беларуская драматургія». Яна праходзіла па кнізе вядомага беларускага літаратуразнаўцы і крытыка старшага навуковага супрацоўніка Інстытута літаратуры імя Я. Коласа АН БССР, кандыдата філалагічных навук С. С. Лаўшука.

На канферэнцыі загадчык кафедры беларускай літаратуры, кандыдат філалагічных навук І. Ф. Штэйнер расказаў пра вялікі і плённы жыццёвы і творчы шлях Кандрата Крапівы.

Студэнт 5-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта В. Яцухна сваё выступленне прысвяціў манаграфіі С. С. Лаўшука «Кандрат Крапіва і беларуская драматургія». Выступіў і сам аўтар гэтай кнігі. Ён расказаў аб сваёй працяглай працы па даследаванню багатай творчай спадчыны Кандрата Крапівы, аб шматлікіх сустрэчах з Кандратам Кандратавічам, перадаў прывітанне юбіляра і шчырыя пажаданні здароўя і поспехаў у працы і вучобе выкладчыкам і студэнтам ГДУ. Вучоны адказаў на пытанні ўдзельнікаў канферэнцыі.

З удзелам С. С. Лаўшука і І. Ф. Штэйнера адбылася літаратурная сустрэча, прысвечаная юбілею К. Крапівы і ў Гомельскім педвучылішчы.

*Рэцэнзіі нашых чытачоў*

# НА ПУЛЬСЕ ЖЫЦЦЯ

П'еса «На вастрыі» — адзін з апошніх і вельмі значных твораў Кандрата Крапівы. У ім аўтар закранае спрадвечныя тэмы: дабра і зла, сумленнасці і абыякавасці, кахання. Драматург раскрывае іх на прыкладзе медыцынскага калектыву. І не выпадкова. Менавіта медыцына з'яўляецца лакмусавай паперкай для выяўлення лепшых чалавечых якасцей.

Галоўны герой п'есы — асоба, аб якой мы гаворым: з раскрытай душой і сэрцам. Мы разам з аўтарам сімпатызуем герою, бо ён — Урач і Чалавек з вялікай літары. Гэта чалавек актыўнай жыццёвай пазіцыі, які «фальшу не дапусціць». Але жыццё — не гладкі шлях. На ім здараюцца выбоіны, нават такія людзі, як Галубовіч, — не машыны. Яны таксама могуць хвалявацца і памыляцца. Так у сцэне, дзе Галубовіч абвінавачвае жонку ў здрадзе, ён выходзіць з сябе, пачынае крычаць. І мы бачым перад сабой жывога чалавека, з такімі ж, як і ў нас, чалавечымі пачуццямі.

Цяжкае выпрабаванне для Галубовіча аперыраваць чалавека, з якім жыве яго былая жонка. Але ўрач павінен адкінуць асабістую крыўду, нават у думках не дапусціць помсты. Галоўнае для яго — жыццё чалавека. Галубовіч змагаецца за яго. Але Якавец памірае. Прычым, не па віне Галубовіча, а Грушэўскага. Менавіта ён бачыў, што чалавек хворы, але нічога не зрабіў, каб выратаваць яго.

На жаль, у жыцці сустракаюцца яшчэ такія грушэўскія, і аўтар асуджае іх.

На працягу ўсяго твора драматург супрацьпастаўляе Галубовіча і Грушэўскага: дзе адкрыта, а дзе ўскосна, і ўвесь час адчуваецца паміж імі барацьба. У ёй і праяўляецца сапраўдная чалавечая годнасць і нікчэмнасць.

У п'есе Грушэўскі за паклёп на Галубовіча атрымаў толькі строгую вымову. І гэта выклікае наша абурэнне, жаданне больш рашуча і дзейсна змагацца супраць такіх тыпаў.

Блізкі да Грушэўскага на поглядах на жыццё і Якавец. Гэта чалавек, які імкнецца жыць «як усе». Вось яго жыццёвае крэда: «Мо блату хто й не рад, а мне ён — родны брат». У гэтых словах выкрываецца ўся натура Якаўца.

Бадай што самы складаны вобраз — гэта жонка Галубовіча. Цяжка асуджаць яе за тое, што яна разышлася з ім і стала жыць з Якаўцом. Для Галіны Паўлаўны ён аказаўся больш блізкім чалавекам, і калі б не яго смерць, напэўна, пражыла б з ім усе астатнія гады. Здрадзіла ж яна свайму першаму мужу «душой», калі на кватэры ў Якаўца ўбачыла як жыве ён і чым даецца яму гэта шыкоўнасць. Галіна Паўлаўна вельмі добра засвоіла, што добра, а што дрэнна. Аднак гэта жанчына яшчэ не прыйшла канчаткова да. такіх як Якавец, хаця, магчыма, калі б той не памёр, стала б з імі ў адзін рад. Жыццёвыя абставіны вымусілі вярнуцца яе да былога мужа. Гэта вяртанне засведчыла сілу Галубовіча, трываласць яго кахання.

У вобразе медыцынскай сястры Зоі Антонаўны драматург паказаў лепшыя рысы характару жанчыны: сціпласць, шчырасць, гатоўнасць адмовіцца ад свайго каханага чалавека дзеля шчасця другой жанчыны.

Можа не такі цікавы, як хацелася б, вобраз загадчыка хірургічнага аддзялення. Надта ж ён нейкі «бяззубы», хаця па свайму службоваму становішчу павінен быць не сузіральнікам канфлікту, а актыўна ўмешвацца ў яго вырашэнне, на прынцыповай аснове дамагацца справядлівасці.

П'еса «На вастрыі» закранае надзённыя пытанні, якія можа задаць сабе кожны сумленны чалавек. Менавіта сёння, пасля работы XXVII з'езда КПСС, мы адчуваем неабходнасць яшчэ больш актыўна весці барацьбу супраць тых, хто перашкаджае нам крочыць наперад. Кожны з нас пастаянна павінен быць на вастрыі жыцця, як і сам Кандрат Крапіва і яго станоўчыя героі.

**С. ХАНЕНЯ,**
**слухач падрыхтоўчага аддзялення ГДУ.**

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет кафедр грамадскіх навук выказваюць глыбокае спачуванне прафесару кафедры філасофіі **РУБЦОВУ** Мікалаю Іванавічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат, увесь калектыў біялагічнага факультэта выказваюць глыбокае спачуванне дэкану біяфака **АЛЕШКУ** Сцяпану Фёдаравічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

Дэканат, камітэт камсамола, прафбюро эканамічнага факультэта глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай смерці студэнткі гр. Т-51 Алены **ГАНЧАРОВАЙ** і заўчаснай смерці студэнта гр. Т-42 Васіля **УСІКА** і выказваюць глыбокае спачуванне бацькам і родным памёршых.

АЗ23146

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п. 3-11, т. 57-16-52.

Заказ 189.